ГАЛОЎНАЕ — НЕ РЫЗЫКАВАЦЬ

ДАІ дае парады вадзіцелям па эксплуатацыі аўтамабіля ў моцныя маразы

«Умудроныя вопытам аўтааматары не чакаюць маразоў, а рыхтуюцца да зімы загадзя. Шэраг нескладаных маніпуляцый у маторным адсеку аўтамабіля дасць магчымасць паспяхова эксплуатаваць машыну і ў сцюжу, і ў слату, не баючыся, што аўто адмовіцца заводзіцца ў самы непадыходзячы момант. Калі маразы ўсё ж засталі знянацку, заўсёды можна выкарыстаць шэраг прыёмаў, каб аблягчыць жыццё свайму аўтамабілю», — паведаміла кіраўнік прэс-службы ДАІ Мінска Таццяна ХАРЛІНСКАЯ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Перад зімовым перыядам эксплуатацыі аўтамабіля неабходна заліць свежае масла. Сінтэтычнае або паўсінтэтычнае, але ні ў якім разе не мінеральнае, якое на марозе гусцее. У сістэму ахалоджвання павінна быць заліта ахалоджвальная вадкасць правільнай канцэнтрацыі. Эканомія на антыфрызе і разбаўленне апошняга вадой выйдзе бокам. Варта таксама праверыць шчыльнасць акумулятарнай батарэі, даліць дыстыляванай вады, калі трэба, павысіць ёмістасць да аптымальнай. У моцныя маразы ніколі не пашкодзіць забіраць акумулятар дадому для сагравання і падзарадкі. Неабходна таксама замяніць усе фільтры (маслены, паветраны, паліўны).

З бензінавымі рухавікамі на марозе пасля доўгай стаянкі можа ўзнікнуць праблема з запускам. Бензін пры нізкіх тэмпературах дрэнна выпарваецца. Калі акрамя марозу прысутнічае і высокая вільготнасць паветра, існуе рызыка «заліць» свечкі. Калі такое адбылося, іх трэба выкруціць. Калі пялёсткі і графітавы стрыжань мокрыя, праблема вырашаецца двума спосабамі: або заменай камплекта свечак на новы, або награванне «мокрых» свечак дома на газе. З цёплымі свечкамі рухавік, як правіла, заводзіцца з паўабароту.

Дызельным аўтамабілям у халоднае надвор'е даводзіцца асабліва цяжка, калі ў баку аказалася «летняе» паліва. Пры нізкіх тэмпературах паліва гусцее, а то і зусім ператвараецца ў парафінападобную масу ў паліўнай помпе высокага ціску (ППВЦ), фарсунках, паліўным фільтры. Калі такая бяда здарылася, адзіным правільным рашэннем будзе кіпень, які трэба акуратна ліць на ППВЦ, фарсункі і паліўны фільтр. Аднак ліць трэба вельмі акуратна, каб не заліць генератар і стартар, якія пажадана ўкрыць цэлафанам.

Пры нізкіх тэмпературах гусцее не толькі салярка і масла, але і ахалоджвальная вадкасць (АВ). У асобных выпадках апошняя замярзае, на што ўказвае перагрэў рухавіка. У такой сітуацыі трэба заглушыць матор і пастаяць 10-15 мінут, не адкрываючы капот, а потым завесці зноў. Калі прычынай перагрэву быў толькі адзін ледзяны корак, які заблакіраваў цыркуляцыю АВ, часовае спыненне растопіць гэты корак, і можна будзе працягваць рух. Калі коркаў некалькі, то лепш выклікаць эвакуатар, які даставіць аўто ў цёплы гараж, дзе можна будзе замяніць АВ больш марозаўстойлівым саставам.

Зімой спецыялісты настойваюць на абавязковым прагрэве рухавіка да ніжняй мяжы працоўнай тэмпературы. Пры вольным абыходжанні з педаллю акселератара язда на непрагрэтым рухавіку з уключанай печкай, магнітолай і святлом фар можа скончыцца незапланаваным спыненнем. Перад запускам рухавіка неабходна разагрэць акумулятар. Для гэтага можна ўключыць далёкае святло на 10 секунд. Праз паўмінуты пасля выключэння фар можна спрабаваць завесціся. Калі пасля халоднага запуску не цалкам прагрэты матор заглушыць, завесціся зноў можа атрымацца не адразу. У такім разе не трэба спяшацца. Лепш пачакаць некалькі мінут, чым сутыкнуцца з паломкай стартара або акумулятара. Каб рухавік лепш праграваўся і павольней астываў на марозе, мае сэнс уцяпляць радыятар — паміж рашоткай радыятара і самім агрэгатам ставяць ліст шчыльнага кардону. Гэта таксама дапаможа зберагчы радыятар ад пашкоджанняў, паколькі драбкі солі, якія трапляюць у соты ў доўгатэрміновай перспектыве здольны выклікаць карозію і парушыць герметычнасць сістэмы ахалоджвання. Калі аўтамабіль з механічнай каробкай перадач, заўсёды перад «халодным» запускам выціскаем счапленне. Больш таго, калі машына завялася, але паводзіць сябе не зусім адэкватна, счапленне трэба патрымаць выціснутым мінуту-паўтары. Гэта на першых парах палегчыць работу рухавіка і знізіць шанц заглухнуць. Таксама неабходна памятаць, што халастое кручэнне стартара на працягу больш чым 10 секунд небяспечна заменай самога стартара, што даволі дорага.

Каб у машыне ў моцныя маразы надзейна адкрываліся дзверы і багажнік, можна змазаць гумавы ўшчыльняльнік сіліконам.

«Аднак самая галоўная парада Дзяржаўтаінспекцыі аўтааматарам — не рызыкаваць і ў час моцных маразоў ці цяжкіх умоў надвор'я пакінуць свой аўтамабіль на паркоўцы, а самім скарыстацца паслугамі грамадскага транспарту. Гэта зберажэ і аўтамабіль, а галоўнае — зменшыць рызыку трапіць у непрыемную сітуацыю на дарозе», — адзначыла Таццяна Харлінская.

БЕЛТА.

Канфіскаваны тысячы «шэрых» аўташын

Супрацоўнікамі ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Беларусі па Гомельскай вобласці праводзіліся рэйдавыя мерапрыемствы, накіраваныя на спыненне незаконна ўвезеных таварна-матэрыяльных каштоўнасцяў на тэрыторыю Беларусі.

На складзе аднаго з Гомельскіх камерцыйных прадпрыемстваў знаходзілася на захоўванні больш за 3000 аўташын, з іх амаль 1500 адзінак — без дакументаў, якія пацвярджаюць іх набыццё, паведаміла рэдакцыі **спецыяліст Дэпартамента фінансавых расследаванняў КДК Беларусі Лілія ЧАТЫРБОК.**

Эксперты КДК выявілі, што гэтая прадукцыя была ўвезена ў Гомель з тэрыторыі Расіі. Потым аўташыны на суму каля 800 млн рублёў былі канфіскаваны і змешчаны на склад часовага захоўвання. Матэрыялы праверкі накіраваны ў суд для прыняцця канчатковага рашэння. Санкцыя за гэтае правапарушэнне прадугледжвае штраф да 50 базавых велічынь з канфіскацыяй тавару.

Сяргей КУРКАЧ.

Плюс адлегласць — мінус аўто...

Прадставіўшы ў пункт мытнага афармлення дакументы з непраўдзівымі звесткамі, індывідуальны прадпрымальнік застаўся без машыны, кошт якой папярэдне ацэнены ў 600 мільёнаў беларускіх рублёў.

Аўто маркі DODGE RAM 1500, выпушчанае ў 2013 годзе, паводле прадстаўленай інфармацыі, мела прабег больш за 38 тысяч міль (больш за 61,1 тысячы кіламетраў). Гэтыя лічбы выклікалі ў супрацоўнікаў Мінскай рэгіянальнай мытні падазрэнне.

— Машына выпушчана параўнальна нядаўна. Да таго ж яна практычна не мела прыкмет эксплуатацыі, — распавёў карэспандэнту «Звязды» **начальнік аддзела па барацьбе з кантрабандай і адміністрацыйнымі мытнымі правапарушэннямі Мінскай рэгіянальнай мытні Аляксандр ШАЎЧЭНКА.**

Тэхнічны пашпарт на аўто адправілі на экспертызу, якая паказала, што звесткі пра прабег сапраўды былі адкарэктаваны. Насамрэч машына «наездзіла» на 30 тысяч міль менш, чым сведчыла заяўленая лічба. Як адзначыў Аляксандр Шаўчэнка, велічыня прабегу ўплывае на ацэначны кошт. Непраўдзівыя звесткі былі прадстаўлены з мэтай ухілення ад аплаты мытных плацяжоў у поўным аб'ёме. Машыну канфіскавалі як прадмет адміністрацыйнага правапарушэння.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

■ Крымінал, здарэнні

САЛДАТ УЦЁК З ЧАСЦІ І НАПАЎ НА ПРАДАЎЦА

Яшчэ 17 студзеня салдат тэрміновай службы без дазволу пакінуў брэсцкую вайсковую часць. Хлопец хаваўся на паддашку адной з нежылых пабудоў у Брэсце. Калі скончыліся запасы ежы, ён пайшоў у краму прадпрыемства «Залаты Цімір». Было гэта 19 студзеня. Пра далейшае расказала старшы інспектар аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў Дэпартамента аховы МУС краіны Алена ЯРМАЛІНСКАЯ:

— 19 студзеня а 23 гадзіне экіпаж аддзела аховы Маскоўскага раёна Брэста ў складзе прапаршчыкаў Міхаіла Селівоніка і Сяргея Дышко выехаў на спрацоўку трывожнай сігналізацыі ў магазін па вуліцы Ковельскай. Міліцыянеры знайшлі там параненую супрацоўніцу. Яна расказала, што ў гандлёвую залу зайшоў невядомы і хутка пачаў складваць у пакеты прадукты. На яе пытанне, ці ёсць у яго грошы, ён адказаў агрэсіяй, стаў наносіць множныя ўдары нажом.

Прапаршчыкі выклікалі падмогу і сталі шукаць зламысніка па слядах. Менавіта след прывёў да закінутага дома па вуліцы Вузкай. На паддашку яны знайшлі ўцекача. Штык-нож быў схаваны за блокам. Супраціўлення ён не аказаў. Высветлілася, што былы салдат прызываўся на службу з Пінска. 20 студзеня заведзена крымінальная справа ў дачыненні да былога салдата.

Яна СВЕТАВА.

З КЛУБА ДАДОМУ — НА ЧУЖЫМ АЎТО

Каля дзвюх гадзін ночы ўвагу нарада Фрунзенскага (г. Мінска) раённага аддзела Дэпартамента аховы МУС прыцягнуў малады чалавек, які схіліўся над аўтамабілем «ВАЗ» каля дома па вуліцы П. Глебкі. Капот машыны быў адчынены. Убачыўшы міліцыянераў, хлопец паспрабаваў збегчы, аднак быў затрыманы. Малады чалавек быў нападпітку. Але гэта не ўся гісторыя яго «подзвігаў»...

Па словах прэс-афіцэра Фрунзенскага РУУС г. Мінска Веранікі Стрэльскай, 19-гадовы мінчанін пасля адпачынку ў начным клубе вырашыў ад дома таварыша дабрацца дадому... на аўтамабілі. На вочы патрапіліся «Жыгулі». Праўда, спробы завесці чужы аўтамабіль ключом ад паштовай скрыні поспеху не прынеслі. Тады ўгоншчык папросту замкнуў правады напрамую. Аднак, праехаўшы заднім ходам, п'яны кіроўца ўрэзаўся ў дрэва, пасля чаго адчыніў капот, каб праверыць спраўнасць машыны. Якраз у гэты момант ён і патрапіў у поле зроку міліцыянераў.

Як было ўстаноўлена, затрыманы раней прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці звыш дзясятка разоў — за дробнае хуліганства, ужыванне алкаголю ў грамадскіх месцах, кіраванне транспартным сродкам нападпітку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗАБІЛІ ПРАДАЎЦА. ЁСЦЬ ПАДАЗРАВАНЫ

Увечары 19 студзеня ў харчовай краме райцэнтра Ушачы знайшлі труп 55-гадовай прадаўшчыцы.

— Аб страшнай знаходцы ў праваахоўныя органы паведаміла мясцовая жыхарка. На месца здарэння прыбылі найбольш кваліфікаваныя следчыя, якія спецыялізуюцца на расследаванні злачынстваў гэтай катэгорыі, супрацоўнікі органаў унутраных спраў, спецыялісты Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, — паведаміла «Звяздзе» **Іна Гарбачова, афіцыйны прадстаўнік упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці.** Падчас агляду месца здарэння было ўстаноўлена, што з крамы выкрадзена выручка — каля 2,5 мільёна беларускіх рублёў. Па падазрэнні ў здзяйсненні злачынства супрацоўнікамі міліцыі затрыманы мясцовы жыхар, 1968 года нараджэння.

— Цяпер вядзецца праца па зборы доказнай базы, каб праверыць дачыненне грамадзяніна да здзяйснення асабліва цяжкага злачынства, — дадалі ў вышэйзгаданым упраўленні.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЦУКЕРКІ З ПРАТЭРМІНОЎКАЙ

Пратэрмінаваныя прадукты , а гэта 19 тысяч каробак з шакаладнымі цукеркамі і амаль 4 тысячы ўпаковак «Індывідуальны рацыён харчавання», выявілі супрацоўнікі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі УУС Гомельскага аблвыканкама і ІМПС Навабеліцкага раёна ў Гомелі.

Прадукты, вырабленыя ў Германіі і Расіі, захоўваліся ў двух гаражах гамяльчан. У момант праверкі ў адным з дамоў якраз ішоў працэс перапакавання пратэрмінаванай прадукцыі з мэтай утойвання рэальных тэрмінаў прыдатнасці. Начальнік УБЭЗ УУС Гомельскага аблвыканкама Валерый Атрошчанка паведаміў, што выяўленыя ласункі канфіскаваны, а цяпер вырашаецца пытанне аб прыцягненні вінаватых да адміністрацыйнай адказнасці.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ЗАМЕЖНЫ ЗЛОДЗЕЙ

У Пінску затрыманы 43-гадовы грамадзянін Украіны, які займаўся крадзяжамі ў навучальных установах. А затрымалі злодзея ў пінскай школе № 11 дзякуючы смеласці і рашучасці дырэктара і пільнасці настаўнікаў.

Зламыснік прайшоў у школу перад пачаткам заняткаў пад відам бацькі вучня малодшых класаў. Але на падазронага грамадзяніна звярнула ўвагу настаўніца. Яна ж здолела яго прывесці ў кабінет дырэктара. На пытанні дырэктара школы няпрошаны госць даваў блытаныя адказы — яго адразу западозрылі ў крымінале. Калі дырэктар зачыніў дзверы кабінета і паспрабаваў зрабіць званок у міліцыю, злодзей выхапіў нож і ўдарыў кіраўніка школы. І ўсё ж адважныя педагогі здолелі ўтрымаць злачынцу да прыезду аператыўнай групы.

Міліцыянерам ужо вядома пра серыю крадзяжоў, якія здзейсніў гэты грамадзянін у Гродне і Гомелі. А вось пінскія «гастролі» скончацца для яго, хутчэй за ўсё, турэмнымі нарамі.

Яна СВЕТАВА.

И З В Е Щ Е Н И Е

Государственное производственное объединение

«МИНСКСТРОЙ»

ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

объекта «Комплексный проект застройки жилой территории в границах улиц Притыцкого, Скрипникова, Одинцова, Лобанка (микрорайон № 3). Жилой дом № 36 по генплану» в г. Минске,

опубликованную в газете «Звязда» 31 декабря 2013 года:

Начало строительства жилого дома – 27 ноября 2013 года.

Предполагаемый срок ввода в эксплуатацию в соответствии с ПОС – 2 сентября 2014 года.

Генеральный директор *Н.В.Милошевский*

УНП 100071325